# Голас Радзімы

№ 16 (1638)
24 красавіка 1980 г.

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ
(БЕЛАРУСКАЕ ТАВАРЫСТВА «РАДЗІМА»)

Выдаецца з 1955 г.
Цана 4 кап.




20 красавіка 1980 года ў Салігорску быў адкрыты помнік У. І. Леніну.

Фота С. КРЫЦКАГА.

**22 КРАСАВІКА НАША КРАІНА, УСЁ ПРАГРЭСІЎНАЕ ЧАЛАВЕЦТВА АДЗНАЧАЮЦЬ 110-ю ГАДАВІНУ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ УЛАДЗІМІРА ІЛЬЫЧА ЛЕНІНА, ПРАВАДЫРА СУСВЕТНАГА ПРАЛЕТАРЫЯТУ, ЗАСНАВАЛЬНІКА САВЕЦКАЙ ДЗЯРЖАВЫ. СЁННЯШНІ НУМАР «ГОЛАСУ РАДЗІМЫ» ПРЫСВЕЧАНЫ ГЭТАМУ ЮБІЛЕЮ ДАРАГОГА ДЛЯ ЎСІХ НАС ЧАЛАВЕКА.**

# ГЕНІЯЛЬНЫМ МЫСЛІЦЕЛЯМ І РЭВАЛЮЦЫЯНЕРАМ

## У МІНСКУ ЎРАЧЫСТА АДКРЫТЫ ПОМНІКІ-БЮСТЫ К. МАРКСУ І У. І. ЛЕНІНУ

**У цэнтры горада-героя Мінска, ля будынка Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі, 17 красавіка ўрачыста адкрыты помнікі-бюсты геніяльным мысліцелям і рэвалюцыянерам, правадырам сусветнага пралетарыяту, заснавальнікам марксізму-ленінізму К. Марксу і У. І. Леніну.**

**У сонечны веснавы дзень, напярэдадні 110-й гадавіны з дня нараджэння У. І. Леніна, тысячы мінчан прыйшлі на мітынг, прысвечаны знамянальнай падзеі.**

**На імправізаванай трыбуне кіраўнікі партыі і ўрада рэспублікі, ветэраны, прадстаўнікі калектываў працоўных.**

**На мітынгу выступіў кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі П. Машэраў.**

**Ён сказаў, што памяць чалавецтва захоўвае нямала вялікіх імён. Але не было ў гісторыі такіх выдатных асоб, як Карл Маркс і Уладзімір Ільіч Ленін.**

**Бязмежная любоў да ідэйных настаўнікаў і правадыроў пралетарыяту нараджае ў гушчыні мас пастаяннае, у вышэйшай меры высакароднае імкненне бачыць іх вобразы, адлюстраванымі ў граніце і бронзе, на плошчах гарадоў і вёсак, на прадпрыемствах, у калгасах і саўгасах, ва ўстановах навукі і культуры.**

**Аўтары помнікаў-бюстаў — скульптар, народны мастак СССР, Герой Сацыялістычнай Працы З. Азгур, заслужаны архітэктар БССР Ю. Грыгор'еў, архітэктар Ю. Казакоў.**

**У рабоце па стварэнню і ўзвядзенню помнікаў-бюстаў удзельнічалі калектывы мінскіх заводаў мастацкага ліцця, абліцовачных пліт з прыроднага каменя.**

● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ●



**Калгас «Запаветы Леніна» Столінскага раёна спецыялізуецца на птушкагадоўлі. Сёлета ён плануе прадаць дзяржаве 400 тон мяса бройлераў, чатыры мільёны штук яек, 500 тон качынага мяса. Чысты прыбытак ад гэтага павінен скласці 450 тысяч рублёў.**

**НА ЗДЫМКУ: загадчыца інкубатарнай станцыі калгаса Л. ДУБЕЙКА.**

### У ВЁСЦЫ — ПАПАЎНЕННЕ

З 1933 года Клімавіцкі сельскагаспадарчы тэхнікум рыхтуе спецыялістаў для сельскай гаспадаркі — заатэхнікаў, ветэрынарных фельчараў. Больш чым 10 тысяч чалавек атрымалі дыпломы аб заканчэнні гэтай сярэдняй навучальнай установы. Нядаўна адбыўся чарговы выпуск спецыялістаў, 236 юнакоў і дзяўчат атрымалі накіраванне на работу ў гаспадаркі рэспублікі.

### БУДУЮЦЦА ДАРОГІ

У раёнах Віцебскай вобласці за чатыры гады гэтай пяцігодкі пракладзена і адрамантавана 1 419 кіламетраў аўтамабільных дарог. Сёлета на іх будаўніцтва, рамонт і ўтрыманне ў вобласці выдзелена яшчэ 37 мільёнаў рублёў.

### МАЛЫШАМ

У Ашмянскім раёне ў адзінаццаці гаспадарках ёсць дзіцячыя сады-яслі. На эксперыментальнай базе «Баруны» два дзіцячыя садзікі. У мінулым годзе новы дзіцячы сад з'явіўся ў калгасе імя Леніна. Заканчваецца такая новабудоўля ў калгасе імя Крупскай.

### ЗАВОДСКІ УНІВЕРСАМ

У цэнтры жылога мікраараёна завода «Гомсельмаш» пабудаваны прыгожы двухпавярховы будынак універсама. Гэта самы буйны ў Гомелі прадуктовы магазін. Плошча яго гандлёвай залы на першым паверсе складае 1 200 квадратных метраў. На другім паверсе — сталовая і бытавыя памяшканні для работнікаў. Магазін і яго падсобныя памяшканні аснашчаны навейшым гандлёвым абсталяваннем і халадзільнымі ўстаноўкамі. Універсам пабудаваны на сродкі «Гомсельмаша». Ён каштаваў заводу каля мільёна рублёў.



**Старшы прадавец секцыі сувеніраў цэнтральнага універмага Віцебска Валянціна МАЦЮШКОВА карыстаецца заслужанай павагай сярод сваіх сяброўак. За выдатную працу яна ўзнагароджана Граматай Вярхоўнага Савета БССР.**

● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ●

*У ПАРТЫЮ ЎСТУПАЮЦЬ ПА ПЕРАКАНАННЮ*

# ПРАГА АКТЫЎНЫХ ДЗЕЯННЯЎ

Як вядома, Камуністычная партыя Савецкага Саюза заўсёды клапацілася і клапоціцца аб павышэнні якасці сваіх радоў і таму з высокай патрабавальнасцю ставіцца да тых, хто звяртаецца з просьбай прыняць у КПСС. Жадаючых уступіць у партыю многа, аднак не кожны можа быць прынятым. Бо заўсёды было так, што партыя рэгулявала рост сваіх радоў. Робіцца гэта дзеля таго, каб састаў КПСС дазваляў найлепшым чынам вырашаць задачы, якія ставіць перад сабою партыя.

Сучасную лінію КПСС у пытаннях прыёму новых членаў растлумачыў XXV партыйны з'езд (1976 год). Партыя прымае ў свае рады толькі тых, гаворыцца ў матэрыялах з'езда, хто на справе даказаў, што ідзе не дзеля атрымання якіх-небудзь выгод, а ў імя самаадданай працы на карысць камунізму. Гэта ленінскае патрабаванне, і яно няўхільна выконваецца.

А якая пазіцыя тых, хто ўступае ў партыю? Ці сапраўды людзі робяць гэты крок па глыбокаму ідэйнаму перакананню або кіруюцца нейкімі іншымі меркаваннямі?

Паколькі абавязкі па прыёму ў партыю, а разам з тым і ажыццяўленне партыйнай лініі ў гэтай справе Статут КПСС усклаў на пярвічныя арганізацыі, раённыя і гарадскія камітэты, то я і рашыў пацікавіцца гэтымі пытаннямі на месцы. Выбраў Баранавічы.

Гэты горад, адносна малады ў Беларусі, вырас пры Савецкай уладзе. Асноўную частку яго насельніцтва складаюць рабочыя і спецыялісты прмысловых прадпрыемстваў, чыгуначнікі, будаўнікі. Пераважна за кошт іх расце гарадская партыйная арганізацыя. Летась, напрыклад, камуністамі сталі 344 чалавекі. З іх рабочых — 73 працэнты. А 80 працэнтаў — людзі ва ўзросце да 30 гадоў. Беларусаў у саставе гарадской партыйнай арганізацыі — 56 працэнтаў. (Дарэчы, у Баранавічах жывуць людзі 70 нацыянальнасцей, і сярод партыйных знойдзеш прдстаўнікоў кожнай).

Я, вядома, мог узяць наўгад некаторыя адрасы, сустрэцца з маладымі камуністамі і пагутарыць з імі, запытаць, чаму, дзеля чаго і як уступілі яны ў партыю. Але мне пашанцавала даведацца аб гэтым прасцей: акурат у той дзень гарком КПБ запрасіў групу маладых, нядаўна прынятых камуністаў для ўручэння ім партыйных дакументаў — членскіх білетаў і кандыдацкіх картачак. І я ўбачыў іх усіх разам, усіх 28 чалавек, убачыў не проста групу людзей, а іх агульны настрой, адчуў і зразумеў іх адносіны да той падзеі, якая толькі што здарылася ў іх жыцці. Па стрыманых, усхваляваных размовах, радасных тварах, вопратцы бачна было: гэты дзень для кожнага—незвычайны. Можна нават сказаць—святочны! Сакратар гаркома Міхаіл Жук, уручаючы дакументы, не проста называў прозвішчы. Ён і павіншаваў прынятых у партыю, і напомніў яшчэ раз, што званне камуніста да многага абавязвае, а потым яшчэ кожнаму асобна сказаў добрае слова. І закончыў так: «Калі ласка, абавязкова заходзьце ў гарком: вы ж наша апора, наша надзея».

Пасля я меў магчымасць з кожным пагутарыць, задаваць любыя пытанні. Для Вячаслава Шлега (слесар, 25 гадоў) стаць камуністам значыла прадоўжыць сямейную традыцыю. Камуністам з гадоў грамадзянскай вайны быў яго дзед, цяпер у партыі бацька і дзядзька. А вось Валянціна Пархімовіч (аператар інфармацыйна-вылічальнага цэнтра, 23 гады) першая ў сваёй сям'і стала членам ленінскай партыі. Бацька яе — слесар, маці — мыйшчыца машын на аўтакамбінаце. Дзяўчына закончыла сярэднюю школу, працавала нейкі час тынкоўшчыцай, цяпер вучыцца ў тэхнікуме на завочным аддзяленні. Намеснік галоўнага тэхнолага завода аўтаматычных ліній Сяргей Караткевіч (29 гадоў), інжынер-канструктар Яўген Чэшка (28 гадоў) закончылі інстытуты.

Гэтыя прыклады характэрныя: у партыю ўступаюць людзі пераважна маладыя, адукаваныя (інстытут, тэхнікум, сярэдняя школа). Спецыяльнасці — самыя розныя, але часцей — слесар, швачка, тэхнік, кантралёр, інжынер... Увогуле, з вытворчасці. Цікава, а хто іх бацькі? Звесткі аб гэтым маладыя камуністы ўказваюць у сваіх анкетах. Тут цяжка нават зрабіць нейкія абагульненні: настолькі розныя ў бацькоў спецыяльнасці, род заняткаў — ад вартаўніка, прыбіральшчыцы, няні да інжынера, педагога, начальніка ўчастка. Што ні анкета, то розныя запісы.

Цікаўлюся нацыянальнасцю. Большасць беларусы, родам з Баранавіч або яго ваколіц. Ёсць рускія, украінцы, ураджэнцы іншых раёнаў рэспублікі і з-за яе межаў. Дык чаму ж гэтыя маладыя людзі не маглі абысціся без партыі? Якія былі іх меркаванні, калі яны падавалі заявы, прасілі ў старэйшых таварышаў рэкамендацыі?

Адна дзяўчына расказала... Жаданне стаць камуністам узнікла ў яе пасля таго, як яна ўпершыню пабывала на партыйным сходзе. «Было цікава, узнімаліся

**сельскія навіны**

## СТВОРАНЫ ЦЭНТР КІБЕРНЕТЫКІ

У Мінску адкрыўся праектна-тэхналагічны інстытут аўтаматызаваных сістэм кіравання ў сельскай гаспадарцы. Ён укамплектаваны спецыялістамі-аграрнікамі, якія маюць вытворчы вопыт і кібернетычную падрыхтоўку, матэматыкамі-праграмістамі. У распараджэнні маладога калектыву —хуткадзеючыя камп'ютэры.

— На парадак дня пастаўлена распрацоўка комплексных мэтавых праграм кіравання, «АСК—сельгас», жывёлагадоўляй, вытворчасцю кармоў і ўрадлівасцю глебы, — гаворыць дырэктар інстытута Мікалай Жылінскі. — Іх укараненне, як паказваюць папярэднія падлікі, дазволіць на дзесяць працэнтаў павялічыць колькасць прадукцыі і адначасова палепшыць яе якасць. Інстытут забяспечыць таксама аўтаматызацыю функцый планавання і ўліку на ўсіх узроўнях гаспадарання. У якасці базавага для эксперыментальнай праверкі праектных рашэнняў па аўтаматызацыі працэсаў збору, накаплення і апрацоўкі пярвічнай інфармацыі вызначаны Гродзенскі раён.

Распрацоўка «АСК—сельгас» базіруецца на трывалай аснове. Кібернетыка ўжо стала надзейнай саюзніцай сялян. Па «заказах» калгасаў і саўгасаў з дапамогай электравылічальных машын размяркоўваюцца фонды мінеральных тукаў, складаецца тэхналагічная дакументацыя на выкарыстанне ўгнаенняў і вапны, аналізуецца бухгалтарская справаздачнасць, вырашаецца шэраг іншых важных задач.

Укараненне комплекснай мэтавай праграмы АСК будзе садзейнічаць паляпшэнню планавання ў сельскай гаспадарцы і ўзмацненню ўздзеяння гаспадарчага механізма на павышэнне эфектыўнасці вытворчасці і якасці работы.

## ВЫГАДЫ КААПЕРАЦЫІ

Першых навасёлаў прыняў пасёлак міжгаспадарчага аб'яднання «Днепр». Кватэры з усімі зручнасцямі атрымалі сяляне, якія з навакольных вёсак прыйшлі сюды працаваць аператарамі, лабарантамі, майстрамі нарыхтоўкі кармоў. Побач з жылымі дамамі будуюцца дзіцячы сад, Дом культуры, магазіны, а неўзабаве з'явіцца санаторый-прафілакторый.

Новы пасёлак узводзіцца за кошт прыбытку аб'яднання, створанага гаспадаркамі Быхаўскага раёна. Скааперававўшы сродкі, яны з дапамогай меліяратараў акультурылі звыш трох тысяч гектараў пойменых лугоў, агульнымі сіламі пабудавалі магутны завод поўнарацыённых брыкетаў і гранул, аўтаматызаваны комплекс для адкорму пяці тысяч бычкоў.

У выйгрышы аказаліся не толькі калгас імя Ільіча, на тэрыторыі якога размешчана прадпрыемства, але і астатнія гаспадаркі-пайшчыкі. Прыбытак аб'яднання, які дасягнуў паўтара мільёна рублёў, у бліжэйшы час падвоіцца. Ён расходуецца як на сацыяльнае пераўтварэнне вёскі, так і для расшырэння грамадскай вытворчасці. У калгасе імя Калініна за гэтыя грошы будуецца малочны комплекс — адзін з шасці, якія запланавана ўзвесці ў гаспадарках аб'яднання. У выніку значна павялічыцца вытворчасць малака і прадставіцца магчымасць дадаткова пастаўляць для адкорму дзве тысячы бычкоў. Прыбытак будзе выкарыстаны таксама на будаўніцтве комплексу па вырошчванню цялушак, буйной свінатаварнай фермы.

Каапераванне сродкаў стала важным рычагом умацавання эканомікі калгасаў і саўгасаў. У рэспубліцы ўжо дзейнічае звыш чатырохсот міжгаспадарчых аб'яднанняў і прадпрыемстваў.

сур'ёзныя пытанні. I мне захацелася ўдзельнічаць у іх вырашэнні». Мабыць, у гэтым, на першы погляд спрошчаным тлумачэнні сутнасць усіх іншых, больш сур'ёзных адказаў, якія мне давялося пачуць. Камуністычная партыя — авангард савецкага народа. Яна існуе для народа і служыць народу, з'яўляецца вышэйшай формай грамадска-палітычнай арганізацыі, кіруючай і накіроўваючай сілай савецкага грамадства. Натуральна, на плечы камуністаў кладзецца вырашэнне самых складаных праблем, кіраўніцтва ўсёй стваральнай дзейнасцю. Значыць, партыі патрэбны людзі свядомыя, актыўныя, самаадданыя. Яны самі заяўляюць аб сабе.

Сярод маіх субяседнікаў быў адзін, прыкметна старэйшы за іншых мужчына — Антоній Бугай. Працуе слесарам у аддзеле галоўнага энергетыка на заводзе аўтаматычных ліній. Нарадзіўся ў Баранавічах 35 гадоў назад, а бацькі яго — з прыгараднай вёскі Малая Калпеніца. Я рызыкнуў задаць Антонію Ісакавічу «правакацыйнае» пытанне:

— Можа, з уступленнем у партыю вы разлічваеце на больш высокую пасаду?

Антоній Ісакавіч не пакрыўдзіўся і сур'ёзна растлумачыў:

— Не разлічваю. Ды і няма ў мяне для гэтага ні падстаў, ні патрэбы. У мяне і так добрая спецыяльнасць, работай сваёй задаволены, заработкам — таксама. А ў партыю ўступіў, дакладней будзе сказаць — мяне прынялі таму, што не замыкаюся ў асабістых інтарэсах — работа, грошы. Я, калі хочаце ведаць, даўно ўжо выконваю розныя грамадскія даручэнні. Цяпер яны будуць называцца партыйнымі...

— Дарэчы, а хто сказаў, што толькі камуністы атрымліваюць высокія, прэстыжныя пасады? — уступіў у гаворку Яўген Чэшка. — Скажам, на нашым заводзе некалькі начальнікаў цэхаў, галоўны канструктар, намеснік галоўнага тэхнолага, галоўны бухгалтар — беспартыйныя.

Сяргей Караткевіч:

— У свой час, калі я быў сакратаром камсамольскай арганізацыі, адзін малады чалавек прасіў у камітэце камсамола рэкамендацыю ў партыю. Яму адмовілі, таму што ні ў чым станоўчым ён не праявіў сябе, свядомасцю сваёй не дацягнуўся да высокага звания — камуніст.

Завод аўтаматычных ліній — маладое і унікальнае прадпрыемства ў горадзе. Тут згуртаваны рабочы калектыў, расце партыйная арганізацыя. Сакратар парткома завода Уладзімір Тамодлін, які ўдзельнічаў у нашай гутарцы, зрабіў такое абагульненне:

— Кожны, хто ўступае на заводзе ў партыю, даказаў гэта права сваімі працоўнымі справамі, сваёй грамадскай актыўнасцю, глыбокім разуменнем палітыкі нашай партыі. А паказных членаў партыі, як гаварыў калісьці Уладзімір Ільіч Ленін, нам і задарма не трэба. Калі часам такія трапляюць у нашы рады, то рана ці позна ад іх даводзіцца пазбаўляцца, або самі яны губляюць сувязь з партыяй.

У кожным раённым і гарадскім камітэтах партыі ёсць свае камісіі, адна з функцый якіх — уважлівае і глыбокае знаёмства з кожным, хто вырашыў стаць камуністам. У Баранавіцкім гаркоме КПБ такую камісію ўзначальвае Марыя Ланкіна. Яна расказала:

— Мы задаволены маладым партыйным папаўненнем: на змену старэйшым камуністам ідзе дастойная змена. Моладзь сур'ёзна ставіцца да вырашэння ўсіх сённяшніх спраў. Вядома, мы асабліва цікавімся сапраўднымі матывамі, чаму чалавек хоча звязаць свой лёс з ленінскай партыяй. Часцей за ўсё называюць прыклад старэйшых таварышаў. Нярэдка гэта прыклад каго-небудзь з членаў сям'і. А ўвогуле, у маладых людзях жыве прага актыўных дзеянняў. Стаўшы камуністамі, яны з найбольшай паўнатой ажыццяўляюць гэтае сваё імкненне.

**Мікола ВАСІЛЕЎСКІ.**







**Фізіка-тэхнічны інстытут АН БССР праводзіць вялікія даследаванні ў галіне трываласці і пластычнасці цвёрдага цела.**
**НА ЗДЫМКАХ: кандыдат тэхнічных навук Ф. САКУЛЕВІЧ з супрацоўнікамі лабараторыі фізікі паверхневых з'яў; пошук вядзе доктар тэхнічных навук С. ДОЎНАР; (злева направа) старшы навуковы супрацоўнік Р. ТАФНЕНЦ, акадэмік АН БССР К. ГОРАЎ і загадчык лабараторыі металазнаўства кандыдат тэхнічных навук С. АСТАПЧЫК падсумоўваюць вынікі даследаванняў.**

**✦ ЖУРНАЛІСТ ПРАВОДЗІЦЬ «ЭКСПЕРЫМЕНТ»**
**✦ ЧЫМ ЖЫВЕ ЗВЫЧАЙНЫ МІНЧАНІН**
**✦ АЎТАРСКАЕ ПАСВЕДЧАННЕ—ШКОЛЬНІКУ**

# ШЧАСЦЕ МІХАІЛА БІРЫЦКАГА

Паволі наступае вячэрні змрок. Нібы зоркі на небе, загараюцца вокны дамоў. Людзі вяртаюцца з работы. I ў кожнай кватэры — сваё святло. Вунь у тым пяціпавярховым доме жыве мой знаёмы. Я ведаю: у іх вельмі ўтульна і цёпла. Гэты клімат сяброўскай цеплыні — ад добразычлівасці кожнага жыхара «маленькай дзяржавы» на другім паверсе. Усмешка, з якой яны заўседы душэўна сустракаюць адзін аднаго, а таксама сяброў, знаёмых,— галоўная рыса гэтай сям'і.

З ёю я пазнаёміўся не зусім звычайна. Упэўненасць у гасціннасці жыхароў майго вялікага горада падштурхнула правесці такі «эксперымент»: зайсці наўгад у любую кватэру мінчаніна. Цікава, што за людзі, як сустрэнуць, што ўбачу, аб чым давядзецца гутарыць?..

I вось, знаходзячыся неяк у мікрараёне Усход-1 (ён з'явіўся ў апошнія гады на Маскоўскай шашы), успомніў пра сваю «задуму». Выбраў адзін, як здалося, ужо абжыты дом (аб гэтым сведчылі даволі вялікія дрэвы ў двары), з хваляваннем — што казаць, калі адкрыюць?— націснуў кнопку званка... Мне пашанцавала. Дзверы хутка адчыніліся, і з'явіўся прывабнага выгляду малады мужчына.

— Добры вечар,— прывітаўся я.— Ці не маглі б вы мне дапамагчы...

— А што здарылася? Вы заходзьце, заходзьце...—адказаў гаспадар і запрасіў мяне ў кватэру.

Каб доўга не азадачваць ветлівага гаспадара, які прапанаваў мне распрануцца і зайсці ў залу, я прадставіўся, расказаў пра задуманы «эксперымент»...

— Вы трапілі таксама да эксперыментатара... Толькі ці ўдалае гэта супадзенне? Але калі так здарылася, будзем знаёмы: інжынер Міхаіл Бірыцкі,—з усмешкай сказаў мой новы знаёмы.

Так я амаль на тры гадзіны стаў госцем гэтай сям'і. У ёй расце сын, сямікласнік Міша, і дачка Таня, вучаніца трэцяга класа. Дзеці і бацька глядзелі мультфільм, а з маім няпрошаным візітам гаспадар хацеў выключыць тэлевізар, але я таксама не мог адарвацца ад экрана, пакуль мультфільм не закончыўся.

Маці, як я потым даведаўся, пайшла да знаёмых. Яе, медсястру і былую акушэрку, папрасілі наведаць новароджанага, дапамагчы ўпершыню выкупаць.

Ва ўтульнай, двухпакаёвай кватэры цякла наша размова. Я цікавіўся справамі гаспадара, поспехамі ў вучобе, і захапленнямі дзяцей, мне шчыра адказвалі на пытанні, расказвалі проста па-сяброўску. I даведаўся я шмат цікавага з жыцця гэтай звычайнай сям'і.

Міхаіл Бірыцкі жыве ў Мінску 20 гадоў. Тут ён закончыў політэхнічны інстытут, стаў супрацоўнікам Навукова-даследчага інстытута комплекснага выкарыстання Палесся. У яго актыве 15 вынаходстваў. Закончана кандыдацкая дысертацыя, якую ён хутка абараняе.

— Часу для адпачынку, на жаль, амаль што няма,— паскардзіўся Міхаіл.— Калі ўдаецца схадзіць з сям'ёй у кіно, лічу за вялікую радасць...

— Але ж усё роўна летам паедзем да дзеда і бабулі,— больш сцвярджаюць, чым пытаюць, дзеці.

— Паедзем. Не да бабулі, дык на дачу. Абавязкова паедзем,— гаворыць бацька, прытуліўшы дачку і сына.

Па ўсім — як сустрэлі мяне, як мы гутарылі — было відаць, што сям'я гэтая дружная, што жыве ў ёй вялікая ўзаемная павага і аўтарытэт бацькі і маці вельмі шануюць дзеці. Інакш наўрад ці вучыўся б так добра Міша, ці дапамагаў бы дома ў хатніх справах бацькам, а сястры — у вучобе, ці з'явілася б у яго цікавасць да спраў бацькі.

Нядаўна сын стаў сааўтарам вынаходства і атрымаў у трынаццаць гадоў аўтарскае пасведчанне. Менавіта ён падаў ідэю замацаваць вяртушку гідраметрычнага прыбора нерухома ў гарызантальнай плоскасці, над распрацоўкай якога доўга думаў бацька і часта з сынам эксперыментаваў дома ў... ванне. Пасля абмеркавання ідэі на «больш высокім узроўні», у якім прыняў удзел малодшы брат Міхаіла Мікалай Бірыцкі — супрацоўнік Навукова-даследчага інстытута фізіка-тэхнічных праблем энергетыкі Акадэміі навук Літвы (ён жыве ў Каўнасе), браты прыйшлі да вываду: адкрыццё. З гэтым пагадзіліся і ў Дзяржаўным камітэце СССР па справах вынаходстваў і адкрыццяў. Усе трое Бірыцкія маюць аўтарскае пасведчанне.

— Напэўна ў школе табе лёгка вучыцца, як стаў вынаходнікам?— спытаў я ў Мішы.

— А там ніхто не ведае пра гэта,— адказаў ён, і здалося, што пытанне не вельмі спадабалася яму.

Бацька адзначыў у Мішы добрыя здольнасці ў чарчэнні, геаметрыі, дзякуючы прастораваму ўяўленню.

— Гэта ён як быццам адчувае, але кім будзе, цяжка сказаць.

— Вядома кім — таксістам. Пакуль я так рашыў, а там будзе відаць,..— бадзёра дапоўніў Міша.

Любоў да тэхнікі ў яго невыпадковая: ад бацькі, які да інстытута быў мантажнікам-вышыннікам. Будуючы Мінскі маторны завод, ён зрабіў другі крок у сваіх тэхнічных пошуках: прапанаваў спрасціць канвеерную лінію, што прынесла шмат выгод. А першае вынаходства Міхаіл зрабіў яшчэ ў дзевятым класе, калі жыў з бацькамі ў вёсцы Хвалава Пружанскага раёна. Зрабіў на бацькоўскай пчалінай пасецы. Яго кармушка для пчол была адзначана атэстатам ВДНГ СССР. «Стеклянная банка с поролоном в полиэтиленовой крышке пчеловода-любителя Михаила Бирицкого» (як там запісана) была ўдзельнікам Усесаюзнага агляду прадукцыі пчалярства. Дарэчы, цяпер Міхаіл зноў вяртаецца да свайго юнацкага захаплення: на яго дачы хутка з'явяцца пчаліныя вуллі. Ён прадоўжыць справу сваіх ужо старых бацькоў — прафесійных пружанскіх пчаляроў. Толькі, зразумела, не ў такім маштабе, як яны ў свой час у калгасе.

Амаль усё, што бачыў я ў кватэры Міхаіла, звязана з яго прафесіяй. Кнігі, слясарны інструмент (ён сам робіць некаторыя дэталі для распрацоўваемых ім прыбораў), тыя ж дэталі, сувеніры-узнагароды, тры бронзавыя медалі ВДНГ СССР, нават ванна з вадою і акварыум, у якім, вось ужо дзесяць гадоў жыве вугор, падораны Акадэміяй навук БССР, — удзячнасць за выкарыстанне прыбораў Бірыцкага. Не кватэра, а сапраўдны музей творчага шляху гаспадара, яго лабараторыя... Усяму хапае месца. Так рацыянальна, змястоўна жыве гэты чалавек і яго сям'я.

Калі я спытаў кожнага пра любімую рэч у доме, Міша-малодшы назваў веласіпед, Таня — канькі, а бацька — шчасце, дадаўшы, што яно, хоць і не рэч, але таксама ёсць у іх доме...

Вядома, для Тані канькі — гэта ўсё яе існаванне. Яна вучыцца ў адной са школ Мінска ў спецыяльным спартыўным класе, які складаецца з фігурыстаў. Расце змена славутым майстрам фігурнага катання! Я бачыў яе прыгожыя касцюмы для спаборніцтваў. Іх шые мама!

Пасля развітання з гэтай звычайнай і, як я ўпэўніўся, шчаслівай сям'ёй мне ўспомніўся пачатак рамана Льва Талстога «Ганна Карэніна», дзе гаворыцца, што ўсе шчаслівыя сем'і падобны адна на адну, а нешчаслівыя — нешчаслівыя кожная па-свойму. Мне здаецца, гэта адносіцца і да шчаслівых сем'яў. Таму што шчасце без свайго асаблівага твару будзе, пэўна, бліжэй да таго ж няшчасця.

**Георгій ПАВУЛЯ.**

# ГРЫБЫ—КРУГЛЫ ГОД

Вырошчваннем грыбоў на плантацыях вучоныя займаюцца даўно. Але «прыручыць» давалі сябе да нядаўняга часу толькі шампіньёны.

Калектыў Беларускага навукова-даследчага інстытута лясной гаспадаркі распрацаваў тэхналогію вырошчвання ў штучных умовах вешанкі і апенькаў.

Вешанку многія грыбнікі не ведаюць. А яна па сваіх смакавых і пажыўных якасцях блізкая да вядомых лісічак. Яе можна тушыць, саліць, марынаваць, рыхтаваць з яе грыбны парашок, экстракт. Яна ўтрымлівае 6,5 працэнта бялку, 4 — тлушчу, больш 20 працэнтаў вугляводаў, усе незаменныя амінакіслоты.

Невялічкая плантацыя па вырошчванню вешанкі была створана летась у Ленінскім доследным лясгасе Гомельскага раёна. Сабраны ўраджай быў прапанаваны рэстаранам «Беларусь», «Зара» і «Сож».

Вырошчванне вешанкі не патрабуе вялікіх матэрыяльных затрат. Для гэтага работнікі інстытута бяруць споры грыбоў і вырошчваюць у спецыяльным асяродзі міцэлій, які потым наносіцца на кароценькія асінавыя чуракі. Спачатку яны захоўваюцца ў склепе, а потым выстаўляюцца на лясной плантацыі, дзе і вырастаюць дзесяткі грыбоў на кожным чураку.

У Ленінскім лясгасе выпрабоўваецца новая тэхналогія вырошчвання вешанкі і апенькаў, распрацаваная кандыдатам біялагічных навук В. Фаміной і аспірантам Л. Гаўрылавай. Яна дазволіць атрымліваць грыбы круглы год. Для гэтага замест асінавых чуракоў выкарыстоўваецца звычайнае пілавінне, якое знаходзіцца ў спецыяльна пабудаванай расцільні. Там падтрымліваецца зададзеная тэмпература. Прыкладна праз месяц вучоныя і работнікі лясгаса мяркуюць сабраць першы ўраджай такіх грыбоў.

## ...ЛЮДИ ВИДЕЛИ В ЛЕНИНЕ ЧЕЛОВЕКА, КОТОРОМУ ВАЖЕН КАЖДЫЙ УСПЕХ НАРОДНОЙ ВЛАСТИ

# «ДОРОГОМУ ИЛЬИЧУ»

ПЕРЕДО мной книга, только что вышедшая из печати. В ней собраны письма трудящихся Белоруссии, адресованные в 1917—1924 годах вождю Октябрьской социалистической революции в России и главе Советского правительства Владимиру Ильичу Ленину. Чем эта книга может заинтересовать читателя?

Один советский поэт както заметил: «Время дорисует Ленина портрет». Справедливость этой мысли в значительной мере и подтверждают письма, публикуемые спустя столько десятилетий издательством «Беларусь». Несмотря на то, что среди 241 послания публикуются лишь несколько ответов Ленина (многие пока не найдены), образ этого человека встает в зримых, живых чертах.

Пожалуй, самое поразительное, в чем наглядно убеждает книга, это то, как человек, впервые решающий сложнейшие политические задачи, обремененный государственными заботами, не имевшими аналога в истории, разрабатывающий теоретические основы социализма и воплощающий их на практике, — этот человек ни на минуту не утерял конкретной, постоянной связи с народом. Его энергия первооткрывателя и преобразователя, его убежденность в правоте своей миссии питались безоговорочной, искренней поддержкой масс.

По существу, не было ни одной акции Советской власти, на которую бы не откликнулись рядовые труженики в личном письме своему Ильичу (так в народе чаще всего звали Ленина). Своим долгом считали они известить Ленина об успехах, пусть пока самых скромных. Рабочие города Полоцка спешат порадовать Ильича тем, что ими «создано мощное техническое сооружение — железнодорожный мост через реку Западную Двину у Полоцка». Жители Витебска делятся своей радостью по поводу начала работы электрической станции «для освещения рабочих окраин города». А минчане с гордостью пишут ему о важнейшем событии — открытии в Белоруссии первого государственного университета.

Письма свидетельствуют, что люди видели в Ленине человека, которому дорог успех народной власти, и потому они держали его в курсе всех ее начинаний. Народ искал в нем главного советчика. Писали, чтобы узнать, как поступить в том или ином случае общественной жизни, обращались за разъяснением сложных вопросов хозяйственного строительства. В труднейшее время гражданской войны работники Рудненского исполкома просят Ленина принять их делегата, чтобы растолковать ему положение о рабочем кооперативе. Ленин тут же отвечает: «Могу принять Вас...» К Ленину приходит телеграмма аптекаря из Жлобина Г. Рабкина, жалующегося на незаконную конфискацию у него велосипеда. За всей своей занятостью — страна находилась в кольце блокады интервентов — Ленин откликается на этот конфликт. Он пишет местным властям: «Немедленно расследуйте строго и проверьте. Телеграфируйте: если нет особых или военных причин, то за конфискацию велосипеда будете наказаны». Ленин берет на контроль это частное событие; и через месяц, удержав в памяти происшествие в Жлобине, возвращается к нему: исправлена ли ошибка. «Предупреждаю, что за отписку без достижения делового результата и без исправления ошибки буду привлекать к ответственности».

Весть о ранении Владимира Ильича врагами революции 30 августа 1918 года вызвала в народе бурю гнева и возмущения. «Как громом, мы были поражены предательскими выстрелами врагов и изменников всемирного пролетариата», — писали коммунисты Дубровенской партийной организации 8 сентября 1918 года. Они поклялись усилить боевую энергию, сплоченность и дисциплинированность.

Ленин выздоровел, но раны вскоре дали о себе знать. И люди, зная о его состоянии, как только могли — словами и делами — старались его поддержать, ободрить, обнадежить. «Мы, — писали железнодорожники Минска, — просим тебя, дорогой Ильич, не увлекаться работой, отдыхай, храни свое здоровье и знай, что для нас самих оно необходимо». Коммунальщики, рабочие и служащие центральной электростанции Витебска, желая сделать Ленину приятное, сообщают ему, что зачислили его почетным машинистом «Водосвета». «Мы, медработники, приказываем тебе не дотрагиваться к делам до полного выздоровления... Будь спокоен». Сотни и сотни таких проникновенных писем получил тогда Ленин.

**Юрий САПОЖКОВ.**

## ЕГО ВЫСТУПЛЕНИЯ ПОКОРЯЛИ НЕПРЕОДОЛИМОЙ СИЛОЙ УБЕЖДЕННОСТИ И ПРАВДЫ

# КАК ВОССТАНОВИЛИ ЗАПИСЬ РЕЧЕЙ ВОЖДЯ

**За цикл работ по восстановлению записей речей В. И. Ленина коллектив научных работников, инженеров, техников, возглавляемый доктором технических наук профессором И. ГОРОНОМ, удостоен Государственной премии СССР 1979 года.**

### РЕСТАВРАЦИЯ! НЕТ, ВОССТАНОВЛЕНИЕ...

Здесь, во Всесоюзной студии грамзаписи — настоящее царство техники: магнитофоны, усилители, электронные анализаторы... И вдруг среди всего этого электронного великолепия, поражающего непосвященного сложностью современных пультов, словно огромный цветок — граммофон. На небольшой коробке—коричневый раструб рупора с загнутыми, чуть потрескавшимися краями...

— Вот на таких аппаратах и воспроизводились первые записи речей Владимира Ильича Ленина, — рассказывает профессор Московского электротехнического института связи Исаак Горон. — С 1918 по 1923 год Ленин около 250 раз выступал перед трудящимися Москвы. Но услышать Ильича хотела вся страна... На помощь пришла звукозапись.

Его речь, записанная в марте 1919 года, была посвящена памяти председателя Всероссийского Центрального исполнительного комитета товарища Свердлова. В специально оборудованных помещениях в Кремле и Центропечати среди других речей были записаны: «Что такое Советская власть», «О трудовой дисциплине», «О работе транспорта», «Обращение к Красной Армии». Эти пластинки жадно слушались крестьянами — ведь многие из них были неграмотны и не могли читать газеты, которые к тому же в тяжелые годы разрухи выходили ограниченным тиражом.

Живой голос Ильича звучал на всю страну. Ленин говорил удивительно просто и понятно. Его речь покоряла непреодолимой силой убежденности и правды. За первые 2 года было выпущено и распространено полмиллиона пластинок.

Звукозаписывающая техника 20-х годов была несовершенна: запись шла с помехами и искажениями тембра голоса. Более того, каждый звукозаписывающий аппарат изменял голос по-своему.

К 1934 году весь тираж ленинских пластинок был практически утрачен, а немногие копии оказались непригодными для воспроизводства повторных тиражей.

— Начиная работы, мы поставили перед собой задачу не реставрации, то есть возврата звучания голоса, записанного на несовершенном аппарате, — рассказывает профессор Горон, — а восстановления звучания подлинного голоса Ильича. Сделать это было нелегко, так как станок, на котором производились записи речей В. И. Ленина, не сохранился, а это означало, что исходные характеристики голоса — его частоту, высоту, интенсивность, тембр — определить нельзя.

### КАК ДЕЛАЛИ ПЛАСТИНКИ

— Первые пластинки тех времен производились из пластмассы на основе специальной смолы — шеллака. Они быстро изнашивались. Шум и помехи — спутники звукозаписи 1919—1921 годов, оказались многократно усилены временем: голос на засоренном фоне едва прослушивался. Так возникла идея перезаписи с так называемых металлических пластинок, — начал свой рассказ заместитель начальника цеха звукозаписи Алексей Аршинов, один из участников работы, которая и для него началась в 1934 году.

Звукозапись в то время велась на толстых восковых дисках. Диск служил основой для производства матриц, которые делались гальванопластическим способом: на его лицевую поверхность наращивали медь. Одна медная матрица в принципе позволяла прессовать не более 500 пластинок, а затем, изнашиваясь, становилась непригодной для работы. Поэтому первую медную копию использовали не для производства пластинок, а для создания большого количества матриц. Специальная технология позволяла создать вторую медную копию, которую можно было проигрывать.

Для восстановительных работ у нас были первые, вторые и третьи металлические копии, — продолжает рассказ Аршинов. — Помимо того, что все они были сильно изношены, трудность заключалась в том, что с этими, уже ставшими историческими копиями нельзя было обращаться вольно: проигрывая стальной или алмазной иглой медную пластинку, можно было испортить медный оригинал. Казалось, работа зашла в тупик.

И все же выход был найден. Каждые 100 метров звуковой канавки одного оригинала тщательно исследовали под микроскопом. Оказалось, щелчки и трески, звучащие при воспроизведении, были вызваны наростами, обнаруженными в канавках. Работа была ювелирной: все дефекты в канавках были тщательно удалены гравером. Помимо наростов в канавках были найдены и углубления, которые также создавали шумовые помехи при воспроизведении. Гравировкой их удалить было невозможно.

Тогда мы решили снять с этой медной копии другую, уже негативную, — говорит Аршинов. — Теперь углубления стали снова наростами, с которыми мог справиться гравер.

Так исправили матрицы.

### ЗАВЕРШЕНИЕ ПОИСКА

— Мы стремились сделать все возможное, чтобы максимально точно восстановить голос вождя, — рассказывает профессор Горон. — Устранение шумов и помех при помощи специальных шумоподавителей было только частью задачи. Не менее важно было восстановить те составляющие звука, которые слабо воспроизводились, восстановить тембр звучания ленинских речей. Сложность заключалась в том, что была неизвестна необходимая корректировочная характеристика.

Тогда-то и была выдвинута профессором Гороном идея — применить для восстановления записей анализ статистических спектров голоса Ленина.

Человеческий голос обладает акустическими особенностями, что позволяет отличать голос одного человека от другого. И в то же время в сложной записи звуков человеческого голоса имеется общее—статистический спектр, своеобразная диаграмма голоса позволяет судить о его особенностях.

— Мы построили статистические спектры голоса В. И. Ленина и сравнили их со спектрами голосов людей, имеющих приблизительно ту же высоту, — рассказывает профессор, — это позволило определить и вероятностную характеристику корректирования. Так подобрали ключ к восстановлению тембра. Но необходима была точная характеристика корректирования. Для этого сделали большое количество вариантов записей с различными отклонениями от вероятностной корректировочной кривой, и все они были представлены людям, работавшим с Лениным, знавшим его, — старым большевикам. Отобранные варианты стали эталонами.

Многолетний труд ученых и технических работников позволил в разные годы выпускать пластинки с речами В. И. Ленина: в 1950 году вышла пластинка с шестью речами, а в 1966 — долгоиграющая с восемью речами. Затем удалось улучшить звучание еще двух ленинских речей, и в 1978 году была выпущена долгоиграющая пластинка уже с десятью речами.

Так живое ленинское слово стало достоянием миллионов слушателей всего мира.

**Елена ПРАЛЬНИКОВА.**
(АПН).



**Раніца на Блакітных азёрах.**
**Фота П. ЗАХАРАНКІ.**

## ДЭЛЕГАЦЫЯ З ГДР

**У сталіцы Беларусі знаходзілася дэлегацыя Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі на чале з намеснікам Старшыні Савета Міністраў ГДР, міністрам аховы навакольнага асяроддзя і воднай гаспадаркі ГДР Г. Райхельтам. Кіруючыя работнікі, якія прыбылі ў нашу рэспубліку для азнаямлення з вопытам ачысткі сцёкавых вод прамысловых прадпрыемстваў, мелі сустрэчу з першым намеснікам Старшыні Савета Міністраў БССР У. Міцкевічам. Ён расказаў пра ажыццяўляемыя праграмы рацыянальнага выкарыстання зямельных і водных рэсурсаў, аховы навакольнага асяроддзя. Члены дэлегацыі агледзелі славутыя мясціны Мінска, зрабілі паездку на вадаёмы Вілейска-Мінскай воднай сістэмы і «блакітнага» кольца горада. Затым дэлегацыя ГДР выехала ў горад Наваполацк, дзе азнаёмілася з рацыянальнымі сістэмамі ачысткі прамысловых сцёкаў на прадпрыемствах вытворчага аб'яднання «Палімір» і завода бялкова-вітамінных канцэнтратаў.**

# LENIN AS A PERSONALITY

By Anatoly LUNACHARSKY

**Anatoly Lunacharsky (1875-1933) was one of the first members of the Communist Party, Lenin's comrade-in-arms, a Soviet statesman, writer, critic and art scholar.**

The more magnificent a movement is and the more complete the command of it by one or another leader, the more powerful, of course, we must expect his thought and his willpower to be. Vladimir Ilyich had a distinctively striking, clear-cut, deeply penetrating, and therefore almost clairvoyant thought. We also know that even in such a steel-strong machinery as is the Communist Party, which was forged in the course of 20 years of struggle, Lenin and his willpower were kind of motor which often gave the necessary impetus and proved to be the decisive element in all Party work. Without for one minute losing contact with the Party majority, Lenin was, in the full sense of the term, the propellent of the Party.

Lenin himself was, of course, well aware of this aspect of any prominent person, the more so of a great person. He for instance would often speak about the "physical strength of the brain" of Plekhanov. I personally heard him say this several times and at first did not fully understand the meaning. It is clear to me now that just as there can be a physically strong person who can simply overpower you, can absolutely put you down on your back, so there can be a physically strong mind, an encounter with which gives you the same feeling of insurmountable power which overwhelms you. The physical strength of Lenin's brain was even greater than the tremendous physical strength of Plekhanov's brain.

Nevertheless, the scope and dimension of thought and willpower do not yet make a personality. They undoubtedly make one outstanding, influential, and designate one as a major figure in the social fabric, but they by no means determine the very character of an individual.

People often think (and not without grounds) that the personal character of an individual does not play any significant part in history. In fact, far from denying the role of an individual in history (within certain bounds), we cannot but feel inclined to believe that, in this case, it is precisely the strength of thought, the intensity of the willpower that play the first role, because everything else comes from society... The fact that Marx or Lenin became revolutionaries, proletarian ideologists and leaders was predetermined by the times. It may be said that in a similar historical and social setting, other people, too, would have arrived at the same philosophy, but the difference is that Marx and Lenin, precisely because of their dimension of thought, had expounded this philosophy with infinitely greater power. As for the other characteristic features of even a great personality they may be of supreme importance for his biography, but viewed in the context of his social role, these features seem to recede into the background.

Vladimir Ilyich, however, had several intrinsic features which were his and his alone, and which, nevertheless, are of colossal social significance.

I wish to dwell on two such features which are both striking and particulary important. And they are important because they characterize Lenin as a **Communist.** I do not wish to say thereby that they are inherent in any Communist in general. No, but they should be inherent in the ideal Communist, in the kind of person we are moulding parallel with the building up of a new society a person that anyone of us **might wish to be,** but who was personified by Vladimir Ilyich to the full.

The first of these two important features is the absence in Lenin of any self-conceit. This is a very significant phenomenon, and it deserves a close study in communist literature. I think this will be done in time, when the questions on **the art of life** will finally take the place they deserve.

It would be absurd to suppose that Lenin's modesty, about which so much is said, bordered on his not understanding his own intellectual and moral strength. But in a person of, so to say, a bourgeois, or, to be more exact, of a pre-communist type, such an outstanding position and such awareness of his own tremendous power would be inevitably accompanied with self-conceit. Even if a person of this type is modest, you will perceive, in his very modesty, an air of posing. He will bear himself like some precious vessel, he will certainly draw attention to himself, and will, while acting his role in history, be a more or less admiring spectator.

Vladimir Ilyich was absolutely free from this, and therein lies his extraordinary communist quality. His natural behaviour and remarkable lack of pretence were by no means some "grey field dress" meant to look different from the gold finery of other great people and of many small people in history. Not at all, Vladimir Ilyich was absolutely natural in his appearance and he reacted in any difficult situation as a bird flies in the air or a fish swims in water because he never looked at himself from the side and never engaged in self appraisals. He never compared his position with that of other people and he was totally and completely absorbed by his work.

In that work he was well aware that he himself was a good worker and that he could do some particular job better than another comrade, or that some other comrades could do that job well only given his assistance and guidance. But behind all that were, so to say, the organizational tasks arising from the work itself.

Vladimir Ilyich was **a man of the cause** in the superlative degree, in a certain profound and sublime meaning of the term. Of course, this dedication to the cause, this unconditional and completely unembellished placing of himself at the service of that cause, is great and magnificent only because the very cause was tremendous, indeed, the greatest cause imaginable.

Vladimir Ilyich lived the life of mankind, above all, the life of the oppressed masses and, even more directly, of the proletariat, especially of the front-rank and class-conscious proletariat. This was the chain which linked him with mankind, and he looked upon himself and his struggle on behalf of this mankind as something absolutely natural and filling his life completely.

However, precisely because Vladimir Ilyich had absolutely no desire to cultivate his personality, to "water" and "adorn" it, because, I'd say, of his complete indifference to his own personality, and because he had completely given it up to the communist workshop, it remained not only powerful, but extraordinary in its integrity and character, absolutely unique, but one that can be a model for everybody.

And now to the second feature. Vladimir Ilyich was a man of exceptionally good humour. This does not mean, of course, that his heart did not bleed and that this did not show in his face when he heard about or saw the suffering of his beloved working masses. All the earthly happenings he took close to heart and in earnest. And yet, he was a remarkably cheerful man.

Why did such joy and good humour live in Lenin's heart? I believe the explanation is that he was fully and totally a practical and vital Marxist. A real Marxist sees all the trends and the future of every given social formation. Vladimir Ilyich allowed that Communists could make mistakes, that, in general, circumstances could run against them, but he could not allow for the victory of the enemy. Just as we, while walking through puddles, in early spring, under a strong rain or wind, are nevertheless aware that May and warmth will come, bringing sunlight and flowers.

Vladimir Ilyich was playing the most difficult chess game in the world. But he knew in advance that he would checkmate the adversary, or, to be more exact, he was aware that the game, in which he was a piece of tremendous importance, the game of the proletariat, would be won without fail.

(1926)



*Monument to V. I. Lenin in Minsk.*

*Photo by E. KOZULA*

# THE EXAMPLE SET BY THE SOVIET COUNTRY

By Eugeniusz **KOSTRZEWA,**
Polish journalist

All in all, I spent 11 years in the Soviet Union — a quarter of my life. Quite a time! While I was there I was a higher school student, that was from 1952 to 1957 and then, later, from 1971 to 1977 I held an important diplomatic post. All this gives me right to say that I have seen Soviet life developing at first hand.

## THE SYMBOL OF THE CENTURY

All over the Soviet country, from Brest in the west to the Kurlles and Kamchatka in the east, from Transcaucasia and Central Asia in the south to Chukotka in the north I have witnessed the people's enthusiastic efforts. I met some of the most distinguished people in the Union Republics, members of supreme Party bodies and state authorities — factory workers, farmers and many representatives of the Soviet intelligentsia — people of many languages and nationalities.

I have admired both the old industrial and cultural centres and the new, mammoth construction projects of this century: their names still ring loud since they have become not only symbols of our times but also the milestones of tremendous achievements of socialist management, the outcome of daring dreams and courageous thought.

Everybody today knows the meaning of those three letters — BAM. The construction of this legendary Baikal-Amur Railroad will make possible a more rational use of the riches of Siberia, the Far East and the Extreme North of the country. The treasures will not only be for the USSR but also for its loyal friends.

It is only a few decades since Lenin's plan of accelerated change from the kerosene lamps to industrial development — the GOELRO Plan — was adopted. Today the Soviet Union has harnessed powerful Siberian and Central Asian rivers.

## THE LIGHT OF OCTOBER

As I recall those days which were described to me by my father, a participant in the events which took place more than 60 years ago, and today evaluate in retrospect of my life the importance of the events of 1917, it sometimes seems that the magnificent revolutionary breakup lasted but an instant... In reality, however, the formulation of the strategy and tactic of revolutionary struggle, the overthrow of the old and the establishment of the new order was an extraordinarily difficult, complex and in principle a new task.

No less difficult was the education of the multinational population to prepare them for participation in the revolutionary events. This required the rallying of all political and ideological reserves of new class forces, those which had taken power.

Today, when more than 60 years have passed since then, we can say without exaggeration that the new Soviet society stood the important and trying test of history. Socialist industrialization and the collectivization of agriculture, the cultural revolution, the solving of the national question, transformed the Soviet country, in a brief historical period, into a powerful socialist state.

## LENINIST PRINCIPLES

From its inception the new society was built on Leninist principles.

Lenin was dreaming about a voluntary alliance of nations which wouldn't allow any one people to oppress any other people. An alliance which would rest on the people's confidence, upon the clear understanding of fraternal unity.

The experience of the Soviet Union's social and economic development is being used and enriched now by other Communist Parties and countries of the socialist community. The consistent and creative application of the laws of socialist construction is the source of the dynamic development of People's Poland and of other socialist countries.

"The unity of the Soviet peoples which stood the gravest trials of history and became an inexhaustible source of the USSR's strength is one of the main conditions of the economic and cultural blossoming of all Soviet nations," writes Edward Gierek.

The solution of the national question in the USSR comprehensively influenced international affairs, greatly strengthened the forces of peace and peoples' freedom. The Soviet Union's example and assistance were important in the struggle and achievements of the national liberation movement which overthrew the colonial rule and brought independence to peoples of Asia and Africa.

History has never before seen such a country of "100 minorities", such a "prison of nations" as it was under tsarism and capitalism, uniting, in such a historically short period of time, peoples of different cultural and socio-economic development levels into one great entity. This became possible because the unity was based on truly democratic, truly internationalist foundations. These foundations were created by socialism which ensured equal opportunities for the truly free and the equal development of all nations, large and small, their friendship and understanding. The internationalist Leninist nationalities policy of the Communist Party became the foundation of this unbreakable unity of peoples.

Speculations about whether the "Bolshevik experiment" would work or not have long since been replaced by profound study of the successful experiment.

ЛЕНІНСКАЯ ТЭМА — ГАЛОЎНАЯ Ў ТВОРЧАСЦІ ПІСЬМЕННІКА ПАЎЛА ТКАЧОВА

# ВЫБІРАЮ ЯГО Ў НАСТАЎНІКІ

Імя беларускага пісьменніка Паўла Ткачова лепш вядомае юным чытачам. Для іх ён напісаў большасць сваіх апавяданняў і аповесцей, прысвечаных Леніну, рэвалюцыі, грамадзянскай вайне.

У хуткім часе выйдуць з друку аднатомнік выбраных твораў пісьменніка — «Час світальнай зоркі» і новая аповесць — «Дзядзя Косця», прымеркаваныя да 110-й гадавіны з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча. Напярэдадні гэтай даты я сустрэлася з Паўлам Ткачовым. Знайшла яго ва універсітэце, дзе ён ужо многа гадоў загадвае кафедрай і выкладае студэнтам літаратуру.

**— Павел Іванавіч, выкладчыцкая дзейнасць займае, вядома, шмат часу. І тым не менш пастаянна выходзяць вашы кнігі, якія сведчаць пра плённую пісьменніцкую працу. Як вы сталі пісьменнікам!**

— Каб адказаць на гэтае пытанне, давядзецца пачаць здалёк. Думаю, што ў маім чалавечым і пісьменніцкім лёсе вялікую ролю адыграла Беларусь, пра якую я ўпершыню даведаўся хлапчуком. Жылі тады мы з бацькамі ў Варонежскай вобласці. Ішла вайна, і да нас пачалі прыязджаць эвакуіраваныя. Сярод іх была Зоя Уладзіміраўна Мазуркевіч, якая стала настаўнічаць у нашай школе. Ад яе я і даведаўся пра Беларусь, пра незвычайную прыгажосць далёкага краю, пра яго таленавітых людзей. Гэтыя расказы ўразілі маё дзіцячае ўяўленне: вельмі захацелася пабываць там.

Доўгі быў шлях да Беларусі. Аднак у рэшце рэшт я паступіў вучыцца ў Беларускі універсітэт, дзе скончыў факультэт журналістыкі.

**— І працавалі па спецыяльнасці!**

— Так. Супрацоўнічаў у дзіцячых газетах «Зорька» і «Піянер Беларусі», у часопісе «Бярозка». Іменна з журналісцкай камандзіроўкі я прывёз сваё першае апавяданне пра Леніна, якое называлася «Заметка». Здарылася так, што ў Магілёве, дзе я выконваў заданне рэдакцыі, пазнаёміўся з рабочым Аляксандрам Пархімчыкам, які расказаў пра адзін шчаслівы ў яго жыцці выпадак — пра сустрэчу ў 1919 годзе на Краснай плошчы з Уладзімірам Ільічом.

**— Чым вас прыцягвае ленінская тэма, якой вы верныя многа гадоў!**

— Я з таго пакалення людзей, якім не давялося бачыць ці слухаць Леніна. Але ж вырас у калгасе імя Леніна, вучыўся ва універсітэце, які таксама носіць яго імя... Гэты чалавек нібы праходзіў разам са мной па жыцці, стаў маім настаўнікам. Я сэрцам і розумам успрыняў ленінскія ідэі, пераканаўся ў іх жыватворнай сіле. Сацыялістычная рэвалюцыя дала магчымасць мне, сыну шахцёра, атрымаць адукацыю, займацца любімай справай.

Я стаў пісаць, таму што хацеў расказаць падрастаючаму пакаленню пра людзей і падзеі, якія вызначылі яго лёс. Акрамя гэтага, мне самому захацелася «пазнаць» Леніна.

**— Якім жа шляхам ішло засваенне ленінскай тэматыкі!**

— Я вывучаў архіўныя матэрыялы, працы Уладзіміра Ільіча, перачытваў творы мемуарнай літаратуры пра Леніна, падарожнічаў па ленінскіх мясцінах: быў у Шушанскім, Ульянаўску, Казані, Краснаярску, Пскове, Разліве, Горках...

Гутарыў з людзьмі, якія сустракаліся з Леніным. Часам здараліся адкрыцці. Напрыклад, у адной з такіх паездак стары лодачнік паведаміў мне гісторыю пра купца, якога за злоўжыванні прыцягнулі да суда і пакаралі. Вёў гэтую судовую справу Уладзімір Ульянаў. Але я дакладна ведаў, што ў Самары Ленін вёў толькі 18 судовых спраў. І ні адна з іх не была падобная на тую, што расказваў стары. Атрымлівалася, што была невядомая—19-я справа! Пазней мне ўдалося знайсці дакументы, якія пацвярджалі словы майго знаёмага. Пра гэта я і напісаў апавяданне «Справа № 19».

У выніку сустрэч, падарожжаў па ленінскіх мясцінах, архіўных і музейных знаходак нараджаліся творы пра чалавека, які ўвайшоў у маё жыццё. Гэта аповесці «Быў месяц кастрычнік», «Час світальнай зоркі», «Сэрца камунара», «Пілінка з Галубінай Слабодкі», «У ліпені 1917», «І ўзгарэлася полымя», зборнікі апавяданняў «Самае галоўнае» і «Вішнёвая квецень» (дарэчы, гэтая кніжка двойчы выдавалася на беларускай мове, потым была перакладзена на рускую і чувашскую), нарысаў — «Імя Леніна ў сэрцы нашым».

**— Апошнім часам пісьменнікі і паэты ўсё часцей звяртаюцца да тэм: Ленін і Беларусь, Ленін і сучаснасць. Яны асэнсоўваюць тыя ці іншыя падзеі, выказванні і ўчынкі правадыра пралетарыяту, якія мелі вялікае гістарычнае значэнне для развіцця беларускай рэспублікі, уздзеянне ленінскіх ідэй на сучаснае развіццё свету. Па-свойму вырашаеце гэтыя тэмы і вы — праз адносіны Ільіча да дзяцей. У вашых апавяданнях дзейнічаюць беларускія хлопчыкі Васілёк, Янка, Рыгорка, Пятрусь, маленькі рыбак з далёкай Італіі... Гэтыя героі створаны фантазіяй аўтара!**

— Не зусім. Некаторыя апавяданні маюць дакументальную аснову. Так, я знайшоў у адным з музеяў малюнак хлопчыка з Магілёўскай губерні Васіля Адамчыка, які ён даслаў Леніну. На ім Уладзімір Ільіч—нібы казачны волат на кані. З гэтага малюнка нарадзілася апавяданне «Наказ».

Дарэчы, кожны факт ці падзея ў маіх творах маюць жыццёвую аснову. Дакладна вядома, як Ленін ставіўся да дзяцей. У той цяжкі, галодны час ён клапаціўся, каб у іх была неабходная ежа, адзенне. Нават тое, што дасылалі хвораму Уладзіміру Ільічу рабочыя, ён адпраўляў дзецям, каб хаця чым-небудзь падтрымаць малых. Ніводнае пісьмо дзяўчынкі ці хлапчука кіраўнік дзяржавы не пакідаў без увагі і адказу. І за гэта яго бязмежна любілі дзеці. Гэтая любоў не памерла, яна перадаецца з пакалення ў пакаленне. І сёння ўжо нашы ўнукі ласкава называюць Ільіча дзядулем.

І таму сустрэчы і размовы Леніна з маімі юнымі героямі — Янкам ці Петрусём—можна лічыць зусім рэальнымі. Бо клопатамі і пра іх былі прасякнуты справы гэтага простага і вялікага чалавека.

**— Напэўна, вобраз Ільіча не быў аднолькавым ва ўсіх творах, ён з цягам часу змяняўся!**

— Для мяне самога Ленін з кожным годам успрымаўся па-рознаму. Спачатку гэта быў манумент, легендарны герой. А потым я ўбачыў шчырага, сціплага чалавека. І ў той жа час вялікага вучонага, гісторыка, палітыка... Мяне ўражвалі яго адносіны да сяброў, да маці, да жонкі, да дзяцей. Напэўна, у яго асобе былі сканцэнтраваны ўсе лепшыя чалавечыя якасці, рысы характару чалавека будучага.

**— Павел Іванавіч, аднойчы вам давялося сустрэцца з пісьменніцай Марыяй Прылежаевай, якая вядома чытачу як аўтар твораў пра Леніна. Аб чым вы размаўлялі — пісьменнікі двух розных пакаленняў, якія пішуць на адну тэму!**

— Мы гутарылі пра дзяцей і, вядома ж, пра Уладзіміра Ільіча. Бо імя гэта непарыўна звязана з гісторыяй, з будучыняй краіны. Кожнае пакаленне савецкіх пісьменнікаў звяртаецца да ленінскай тэмы. І паглыбляе яе. Марыя Прылежаева сказала тады, што вельмі цяжка пісаць пра Уладзіміра Ільіча. Гэта сапраўды так. Таму што задача пісьменніка сёння не толькі ў тым, каб стварыць партрэт правадыра пралетарыяту, але і паказаць, як яго вялікія ідэі жывуць у думках і справах нашых сучаснікаў.

**Гутарку вяла Таццяна АНТОНАВА.**



# АД ПЕРШАЙ АСОБЫ

**Аляксею КАРПЮКУ—60 гадоў**

Грамадскасць беларускай сталіцы 15 красавіка цёпла адзначыла ў Доме літаратара юбілей вядомага празаіка Аляксея Карпюка, які жыве ў Гродна і працуе сакратаром абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў БССР.

Нарадзіўся ён у вёсцы Страшава былога Ваўкавыскага павета (цяпер Беластоцкага ваяводства Польскай Народнай Рэспублікі). Калі хлопчыку споўнілася дванаццаць гадоў, бацькі пераехалі жыць на хутар, што знаходзіўся каля самай чыгункі Беласток — Ваўкавыск. Прыгадваючы тыя гады, пісьменнік прызнаецца: «Успамінаючы дзяцінства, я сябе амаль не бачу сярод равеснікаў за гульнямі. Толькі і запамяталася, як у спякотнае лета ныла спіна і салёны пот засціláў вочы. А то, памятаю, марыў захварэць, каб адпачыць, выспацца».

Праўда, запомнілася з маленства і іншае, тое, што ў многім аказала ў далейшым уплыў на жыццёвы лёс: «У той час вёска Страшава слыла сваёй рэвалюцыйнай дзейнасцю. Рэвалюцыйны дух панаваў і ў нашай сям'і».

І таму ў біяграфіі Аляксея Карпюка многія радкі сведчаць пра барацьбу — з санацыйнымі ўладамі, нямецка-фашысцкімі захопнікамі, за нацыянальную годнасць і сацыяльную справядлівасць.

Пачаў пісаць Аляксей Карпюк даволі сталым чалавекам, працуючы дырэктарам сямігодкі, маючы багаты жыццёвы вопыт. Аповесць яго «У адным інстытуце» была прысвечана студэнтам. Так і павялося. Празаік пастаянна трымае моладзь у полі зроку. Працэс сталення, фарміравання асобы займае яго найбольш. Аповесці «Данута», «Пушчанская адысея» прынеслі аўтару вядомасць, бо чытачам палюбіліся яго жыццёва праўдзівыя героі, адкрыта выяўленая пазіцыя пісьменніка, які вядзе гаворку ад першай асобы.

Важныя надзённыя праблемы сучаснасці, глыбокае асэнсаванне мінулага прысутнічаюць у многіх кнігах Аляксея Карпюка — таленавітага пісьменніка, клапатлівага, шчырага чалавека.



**Народныя ўмельцы. З сівой даўніны, з пакалення ў пакаленне перадаюць яны сваё высокае майстэрства. Адны не маюць сабе роўных у ганчарнай справе, другія славяцца дзівоснымі вырабамі з дрэва, трэція... А трэція, як, напрыклад, неглюбская жыхарка Марыя Калтунова, сталі выдатнымі ткачамі.**

**Паглядзіце на здымак, зроблены нашым фотакарэспандэнтам Іванам КУРМАНОВІЧАМ. Гэтыя ручнікі саткала Марыя Калтунова. На такія вырабы можна глядзець бясконца, дзівіцца непаўторнаму майстэрству. На здымку справа—Марыя КАЛТУНОВА за кроснамі.**

# ВЫСТАЎКА НАРОДНАЙ ТВОРЧАСЦІ

На працягу тыдня ў ашмянскім раённым Доме культуры працавала выстаўка народнай мастацкай творчасці, арганізаваная мясцовым краязнаўчым музеем імя Ф. Багушэвіча. Яе з вялікай цікавасцю пагледзелі сотні жыхароў горада, вёскі і гасцей, аб чым сведчаць шматлікія запісы, пакінутыя ў кнізе водгукаў.

На выстаўцы экспанаваліся 94 работы ашмянскіх умельцаў: карціны, чаканка, разьба і выпальванне па дрэву, лепка з гліны і пластыліну, шкатулкі, гравюры, вышыўкі, дзеючыя мадэлі, узоры ткацтва — пакрывалы, абрусы, ручнікі. 15 лепшых работ адабраны для абласной выстаўкі. У іх ліку карціны работніка прадпрыемства электрасетак Ф. Проніна «Цішыня», «Восень», «Куток лесу ў наваколлях Ашмян», чаканка шафёра М. Стэфаноўскага «Юнацтва», пакрывала і вязаны абрус жыхаркі вёскі Мур-Ашмянка С. Чарняўскай, пакрывалы М. Новік з Ашмян, Н. Стэфаноўскай (вёска Валавікі), А. Вільчэўскай (вёска Кальчуны), М. Герасімовіч (вёска Плябанцы).

Вучань 9 класа Гальшанскай сярэдняй школы С. Селядцоў экспанаваў чатыры свае работы — выраб з рогу «Рыба» і тры інкрустацыі з пластыліну на шкле. «Рыба» адабрана для абласной выстаўкі. Характэрна, што зрабіў яе С. Селядцоў яшчэ тады, калі вучыўся ў чацвёртым класе. На выстаўку ж яна трапіла ўпершыню.

**А. СЯРГЕЙЧЫК.**

# *АБ ПОМНІКУ АРХІТЭКТУРЫ*

*раскажа ілюстраваны каляровымі фотаздымкамі буклет «Палаца-паркавы ансамбль у Гомелі», які выпусціла выдавецтва «Полымя» (серыя «Архітэктурныя помнікі Беларусі»). На высокім беразе Сожа раскінуўся палаца-паркавы ансамбль — выдатны помнік беларускай архітэктуры. Ён ствараўся на працягу многіх гадоў (канец XVIII —першая палова XIX стагоддзяў).*

*З палацам звязаны важныя гістарычныя падзеі. У ім у 1917 годзе адбылося пасяджэнне гарадскога Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў, на якім было прынята рашэнне аб пераходзе ўсёй улады ў рукі Саветаў, потым працаваў Палескі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны тут размяшчаўся штаб Цэнтральнага фронту. Цяпер у ім — Палац піянераў і школьнікаў імя У. І. Леніна і абласны краязнаўчы музей, а ў былым Петрапаўлаўскім саборы — планетарый.*

# ПРЫГОЖАЕ ВАКОЛ НАС





Гляджу на вясёлае алімпійскае медзведзяня, якое моцна сціскае махнатымі лапамі бочачку з надпісам «Мёд», і лаўлю сябе на думцы, што хочацца працягнуць руку і пагладзіць яго карычневую поўсць. Перад такой спакусай устаяць не проста. Імгненне і... на кончыку пальца чырванее кропелька крыві.

Дык вось ён які, Мішка Тані Пагарэлавай, другакласніцы 60-й сярэдняй школы Мінска! Алімпійскі сувенір зроблены з калючак дзядоўніка. Падумалася пра вынаходлівасць, кемлівасць і ўпартасць маленькай майстрыхі, чыімі рукамі створана незвычайнае медзведзяня, якое стала адным са шматлікіх экспанатаў 1-й гарадской выстаўкі дзіцячай творчасці «Прырода і фантазія».

У экспазіцыі сабраны работы хлопчыкаў і дзяўчынак самых розных узростаў больш чым з 50 школ сталіцы Беларусі. Малышы і старшакласнікі сваімі мініяцюрамі, лясной «скульптурай», яркімі пано з прыроднага матэрыялу заклікаюць усіх нас, наведвальнікаў уважліва ўглядацца ў навакольны свет, каб глыбей, паўней усвядоміць яго прыгажосць і шматграннасць.

З мяккага моху на палянцы хітра глядзіць на мяне незвычайная істота. Кручкаваты нос, двайны падбародак з жалудовых шапак, маршчыністы, бугрысты твар з каштанавай шкарлупіны, раскосыя фасоліны вачэй. Але надзела кікімара Тані Будзінскай замест капялюша грыбок-трутавічок і адразу стала падобная на маленькую смешную бабульку.

Пераходжу ад экспаната да экспаната. Узіраюся ў фігуркі казачных герояў, звяркоў і спрабую ўявіць сабе, чым жа былі яны ўсе, пакуль не дакрануліся да іх рукі маленькіх умельцаў.

Дзве дзяўчынкі гадоў сямі аб нечым ажыўлена перагаворваюцца, схіліўшыся над забаўным, маленькім страўсам з кораня аеру. Чутны толькі некаторыя словы.

— ...У мяне жалуды...

— А я папрашу ў брата каштаны.

— ...Коцікі можна...

І я пачынаю разумець, што з сённяшняга дня ў гэтых наведвальніц з'явіцца жаданне самім тварыць, думаць. Гэты смешны страўс зрабіў сваю добрую справу: разбудзіў драмаўшую дагэтуль цягу да прыгожага, што тоіцца вакол нас.

**В. РУСАК.**



**НА ЗДЫМКУ: экспанаты выстаўкі «Ліса-хітруха», «Алімпійскі мядзведзь», «Страус-занайка».**

**Фота Ю. ЗАХАРАВА.**

**У адказах на анкету «Голасу Радзімы», прымеркаваную да 25-годдзя з дня выхаду першага нумара, многія чытачы выказалі жаданне часцей бачыць у газеце песні, абавязкова друкаваць не толькі іх словы, але і ноты. Рэдакцыя прыхільна ставіцца да гэтай просьбы. Сёння мы прапануем вашай увазе новую лірычную песню беларускіх аўтараў.**

# СЛЯДЫ ЮНАЦТВА

*Словы Г. БУРАЎКІНА* *Музыка В. ІВАНОВА*



**Каля бярозак беланогіх**
**Рабіны стройныя стаяць.**
**І стала торнаю дарогай**
**Сцяжынка вузкая мая.**

**І нашы клёны разрасліся,**
**І хуткаплынныя гады**
**Пазамялі апалым лісцем**
**Мае хлапечыя сляды.**

**За сіняватаю імжою**
**Ля нашай згубленай вярсты**
**Каханне новае, чужое**
**Збірае жоўтыя лісты...**

**А нам з табой упарта сніцца**
**Сцяжынка вузкая мая.**
**Бярозак юных завушніцы,**
**Рабін зялёная сям'я.**

## Спорт

## «УРАДЖАЙНЫ» ГОД

Сапраўды «ўраджайным» выдаўся сёлетні год для беларускіх спартыўных дружын. Мы паведамлялі ўжо, што пуцёўкі ў вышэйшую лігу краіны заваявалі хакеісты, баскетбалісткі, валейбалісткі. І вось апошняя навіна: мінская каманда жанчын па ручному мячу «Эканаміст» выйграла рашаючую сустрэчу ў нявіннамыскага «Азота» з лікам 16:12 і стала чэмпіёнам у першай лізе. У наступным сезоне мінчанкі будуць выступаць у вышэйшай лізе.

## «ДЫНАМА» — «ПАЛІЙТАТ»

Дзве міжнародныя сустрэчы правялі на днях хакеісты мінскага «Дынама». Яны прымалі гасцей з Фінляндыі — каманду «Паліітат». Беларускія хакеісты былі мацнейшыя ў гэтых гульнях. У першай сустрэчы яны перамаглі з лікам 8:1, а ў другой — 13:3. Пасля госці правялі сумесныя трэніроўкі з мінскімі дынамаўцамі.

## ПАСПЯХОВЫ СТАРТ

Пачалося першынство Савецкага Саюза па футболу сярод каманд вышэйшай лігі. Паспяхова стартавалі ў ім мінскія дынамаўцы. У першай сустрэчы яны згулялі ўнічыю (0:0) з тбіліскімі аднаклубнікамі. А ў другім туры перамаглі спартсменаў бакінскага «Нефтчы» — 4:0. Потым, ужо дома, дамагліся нулявой нічыёй з ташкенцкім «Пахтакорам».

Пасля трох тураў наша «Дынама» займае трэцяе месца ў турнірнай табліцы.

## ВЫЗНАЧЫЎСЯ БАРЫС ІСАЧАНКА

На міжнародным турніры «Вясеннія стрэлы», які праходзіў у Ерэване, вялікага поспеху дамогся лучнік з Брэста Барыс Ісачанка. Ён упэўнена заняў першае месца, апярэдзіўшы многіх вядомых спартсменаў.

## МАЦНЕЙШАЯ — ЗБОРНАЯ СССР

У Мінску завяршыўся міжнародны традыцыйны турнір жаночых каманд па фехтаванню на Кубак БССР. Ганаровы прыз заваявала зборная Савецкага Саюза, якая ў фінале нанесла паражэнне спартсменкам Расійскай Федэрацыі з лікам 9:1. За зборную краіны выступала мінчанка, алімпійская чэмпіёнка, заслужаны майстар спорту Алена Бялова.

На жаль, на гэты раз не парадавалі сваіх балельшчыкаў беларускія фехтавальшчыцы, якія раней перамагалі ў турнірах. Яны занялі толькі шостае месца. Праўда, ў камандзе БССР былі маладыя спартсменкі, якія яшчэ не маюць багатага вопыту міжнародных выступленняў.

# ПТУШКІ І ГНЁЗДЫ

Дзе толькі не робяць свае гнёзды птушкі! На дрэвах, на зямлі, на дамах, у балоце... А на сядзібе Глушкавіцкага лясніцтва, што на Гомельшчыне, шпакі аблюбавалі процівагу на 36-метровай пажарнай вышцы і зрабілі ў ёй гняздо. Дзяжурны ляснік падымаецца ў кабіне ўгору, а з другога боку процівага з гняздом апускаецца амаль да зямлі. Апусціцца ляснік на дол, а процівага зноў падымаецца. А птушкі нібы абавязкі ліфцёраў выконваюць і не бачаць у гэтым ніякай нязручнасці.

Яшчэ больш цікавае месца знайшоў сабе верабей, збудаваўшы гняздо на электрычным званку Прыбалавіцкай васьмігадовай школы. Але праліча ўся. Пачаліся заняткі, і спакой верабей меў толькі ноччу. Праз некаторы час нервы ў птушкі не вытрымалі — давялося памяняць «кватэру».

**А. ЛОЗКА.**

## Гумар

*Пастар наведаў старога Гарысана, у якога даўно не быў, і застаў яго хворым. На тумбачцы ля ложка стаяла бутэлька віскі.*

*— Гарысан, няўжо гэта твая апошняя ўцеха?*

*— Не, пастар. У шафе ёсць яшчэ адна бутэлька...*

●

*Прэзідэнт адной з англійскіх авіякампаній папрасіў пілота прывезці яму з Афрыкі сапраўднага афрыканскага папугая. Пілот выканаў просьбу.*

*— Усё было б выдатна, — паскардзіўся прэзідэнт свайму прыяцелю, — але гэтая чортава птушка цэлымі днямі крычыць: «Неадкладна павялічце зарплату пілотам!».*

●

*Маленькі шатландзец просіць у бацькі шылінг, каб пайсці ў заапарк і паглядзець на ўдава.*

*— Лепш вазьмі лупу, пайдзі ў сад і паглядзі на чарвяка.*

●

*— Ну што вы ўвесь час скардзіцеся, што кватэра сырая? — незадаволена зморшчыўся домаўладальнік. — Можаце вы гэта даказаць?*

*— Магу, — уздыхнуў кватэранаймальнік. — Учора я знайшоў у крысінай нары шчупака.*

**РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ**

**НАШ АДРАС:**

**МІНСК-ГСП, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 44.**
**ТЭЛЕФОНЫ: 33-01-97, 33-02-80, 33-03-15, 33-16-56, 33-07-82.**

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Зак. 670